# Акцыя " Мы-грамадзяне Беларусі!»




Чарговы этап акцыі " Мы-грамадзяне Беларусі!", прысвечанай Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прайшоў у Баранавічах 13 сакавіка.

Больш двух дзясяткаў школьнікаў сабраліся ў гэты дзень у загсе Баранавіцкага гарвыканкама. Ва ўрачыстай абстаноўцы юнакам і дзяўчатам уручалі самыя галоўныя ў жыцці дакументы – пашпарты.

Удзел у цырымоніі прынялі першы намеснік Баранавіцкага гарвыканкама Наталля Фёдарава, начальнік аддзела па грамадзянстве і міграцыі Баранавіцкага ГАУС Інэса Гетман, начальнік аддзела загс Святлана Валынец, першы сакратар гаркама БРСМ Ганна Ганчарык.

- Ад асобы Баранавіцкага гарадскога выканаўчага камітэта хачу павіншаваць вас з уступленнем у дарослае жыццё, - звярнулася да школьнікаў Наталля Фёдарава. - Уручаючы пашпарты, хачу пажадаць вам быць адказнымі грамадзянамі нашай краіны і годна несці гэтае высокае званне. Шчаслівага шляху вам у дарослым жыцці!

Пасля ўручэння пашпартоў Ганна Ганчарык уручыла двум дзясяткам школьнікаў, якія папоўнілі шэрагі грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", моладзевыя білеты.

А затым прыйшоў час маладым даць клятву: "Мы клянемся сваёй вучобай, сваёй працай умацоўваць аўтарытэт горада Баранавічы. Клянемся быць годнымі памяці нашых дзядоў і прадзедаў, якія аддалі

жыццё за гонар і незалежнасць нашай Радзімы. Клянемся ўсе свае веды, усю сваю працу і ўсе свае сілы аддаць на тое, каб стаць сапраўднымі гаспадарамі зямлі беларускай і ўсяляк спрыяць росквіту Рэспублікі Беларусь"»

- Гэтыя ўрачыстыя хвіліны назаўжды застануцца ў маёй памяці – - падзялілася ўражаннямі ад цырымоніі навучэнка Паліна Вашчыла, навучэнка 8 класа СШ № 9. - Вядома, я хвалявалася. Але пры гэтым вельмі ганаруся, што трапіла ў лік лепшых навучэнцаў горада, якім выпаў гонар прысутнічаць сёння ў гэтай зале.

А для навучэнскі  СШ №14 Надзеі Самахвал гэты дзень запомніцца яшчэ і таму, што менавіта 13 сакавіка дзяўчына адзначае свой дзень нараджэння:

- Не чакала, што ў гэтым годзе ў дзень нараджэння мяне будзе чакаць такі падарунак!

У завяршэнні мерапрыемства начальнік аддзела загс Святлана Валынец правяла экскурсію па аддзелу з наведваннем музейнага пакоя і архіва аддзела.








Наш край


Наш край


Наш край


Наш край






БРСМ
Наш край


ПАШПАРТ
ПАСПОРТ
PASSPORT
Наш край


МЧС
Наш край


ПАШПАРТ
ПАСПОРТ
PASSPORT
Наш край


ПАШПАРТ
ПАСПОРТ
PASSPORT
ПАШПАРТ
ПАСПОРТ
PASSPORT
Наш край